Репозиторий ВГУ

**Бароўка В.Ю.**

**БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПРА ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ Ў АСЭНСАВАННІ ПІСЬМЕННІКАЎ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1940-х гг.**

Час Вялікай Айчынннай вайны быў не самым спрыяльным для літаратурнай творчасці, тым не менш яна працягвала развівацца, асвойваць новыя тэмы і новыя сродкі ўвасаблення рэчаіснасці. Найперш мастацтва слова рабіла свой унёсак у вялікую перамогу над фашызмам, разам з тым яно станавілася прадметам літаратурна-крытычнай рэфлексіі, прычым галоўным чынам з боку саміх творчых асоб. Па афіцыйных дадзеных са 100 членаў Саюза пісьменнікаў БССР 71 прымаў непасрэдны ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне "ў якасці салдат і афіцэраў, значная частка – у партызанскіх атрадах і ва ўстановах па арганізацыі партызанскага руху" [цыт. па: 1, с. 5].

Відаць, першым па часе звароту да праблемы "беларуская літаратура і вайна" стаў артыкул Кузьмы Чорнага "Беларуская літаратура ў дні Вялікай Айчыннай вайны" (1942). Гэта невялікая па аб'ёме праца вядомага айчыннага празаіка тлумачыла месца майстроў мастацкага

слова ў барацьбе з захопнікамі і не прэтэндавала на аналітыку. Ідэя артыкула была выказана ў кароткім абзацы: “Беларускія пісьменнікі разам з родным народам змагаюцца супраць ворага. Іх беларускае мужнае слова гучыць у народзе як кліч змагання, гучыць на фронце, дзе доблесная Чырвоная Армія вядзе няспыннае наступленне і з вялікай сілай гоніць ворага з роднай зямлі” [2, с. 351]. Мэта артыкула, як відаць з прыведзеных слоў, заключалася ў сцвярджэнні актыўнай грамадзянскай пазіцыі пісьменнікаў і ў акцэнтаванні непазбежнасці хуткай перамогі над фашызмам. Лаканічная прэзентацыя мастацкіх твораў спалучалася з публіцыстычнымі адступленнямі пра непазбежнасць хуткай перамогі над захопнікамі ў артыкуле Чорнага “Беларускае мастацтва ў часе Вялікай Айчыннай вайны” (1942). Заслугоўвае ўвагі літаратурнакрытычная праца К. Чорнага “Беларуская проза і драматургія часу Вялікай Айчыннай вайны” (1942), паколькі ў ёй пісьменнік выказвае сваё эстычнае крэда, акцэнтуе ўвагу на праблеме традыцый і наватарства, на сваім разуменні выхаваўчай функцыі літаратурных твораў. Пісьменнік коратка ахарактарызаваў напісанае ў ваенны час М. Лыньковым, К. Крапівой, А. Стаховічам, прыгадаў “Новую зямлю” Якуба Коласа як глыбока трагедыйны твор і адначасова як узор глыбока рэалістычнага адлюстравання свету і чалавека, змястоўнасці, патрыятызму. Літаратура перыяду вайны, у пісьменніцкай трактоўцы, павінна быць духоўнай зброяй народа, умацоўваць любоў да радзімы, але яна яшчэ абавязана быць праўдзівай і цікавай. Паводле К.Чорнага, вайна адкрыла новыя грані беларускага нацыянальнага характару: “Вядомая з старадаўніх часоў гераічнасць беларускага народа выяўляецца сёння ў новай сваёй магутнасці” [2, с. 403]. Вайна, у трактоўцы пісьменніка, – выпрабаванне для народа, для творчай інтэлігенцыі, але “працэс развіцця і росту беларускай літаратуры не спыніўся ў часе вайны. Беларуская літаратура жыве і творыцца, развіваецца далей” [2, с. 404]. Глыбока патрыятычнымі творамі ён назваў навелу “Ірына” М. Лынькова, п’есу “Проба агнём” К. Крапівы. Эстэтычная і этычная каштоўнасць драмы “Проба агнём” тлумачылася майстэрскім асвятленнем канфлікту паміж выкананнем чалавекам вайсковага і грамадзянскага абавязку і ўладкаваннем асабістага жыцця. К. Чорны лічыў патрэбным падкрэсліць: “Беларуская літаратура жыве. Яна – вострая зброя ў руках беларускага народа ў справе яго змагання з ворагамі, з подлымі нямецкімі акупантамі” [2, с. 412].

Артыкулы П. Глебкі пра літаратуру часоў суровага выпрабавання вышлі на заключным этапе вайны. Артыкул “Паэзія барацьбы і перамогі” (1945) ужо сваёй назвай артыкуляваў агульную патрыятычна і грамадзянска мабілізацыйную накіраванасць беларускай паэзіі ваеннага часу. Глебка на самым пачатку нагадаў, што беларускія пісьменнікі падчас вайны не былі сузіральнікамі падзей, што яны змагаліся на франтах і ў партызанскіх атрадах: “Крывёю сэрца напісаны нашымі паэтамі радкі аб разбурэннях і зверствах, зробленых нямецкімі варварамі на беларускай зямлі” [3, с. 102]. Не ўсе тэмы знайшлі аднолькавае шматбаковае выяўленне, бо “савецкія людзі змагаюцца супраць смерці і паміраюць за жыццё, за яго далейшы росквіт” [3, с. 108]. Паводле П. Глебкі, Вялікая Айчынная вайна прынесла новую тэматыку ў беларускую літаратуру: “Радзіма, смутак аб ёй, любоў да яе, клятва аддаць за яе жыццё, яе гарады і сёлы, прыгожыя і выдатныя месцы, Масква, Крамлёўскія зоры, Нёман, Прыпяць, Сож, Мінск, Гомель, Магілёўскае шасэ і Белавежская пушча, – усё гэта знайшло ў нашай паэзіі сваіх таленавітых песняроў” [3, с. 102]. Тэматычныя абсягі паэзіі былі вельмі шырокія, бо аўтары пісалі пра Чырвоную Армію, пра партызан, пра зверствы фашыстаў на захопленай імі тэрыторыі, пра пакуты мірных жыхароў, пра непаўторнасць беларускай прыроды з яе лясамі і крыніцамі. Іншымі словамі, як слушна заўважыў аўтар: “Тэматыка беларускай паэзіі часу Айчыннай вайны – гэта даволі поўны летапіс нашага жыцця і змагання, нашых імкненняў і надзей” [3, с. 103]. Тэзіс “Любоў да радзімы, выказаная ў нашай паэзіі, не абстрактная” [3, с. 103] удала пацвярджаўся аналізам верша А. Куляшова “Над брацкай магілай”. Пятро Глебка падкрэсліў, што Аркадзь Куляшоў перадаў праз вобразы байцоў, якія хаваюць сваіх таварышаў па зброі, агульны настрой людзей, што абараняюць жыццё, родны кут, Радзіму. Па словах П. Глебкі, правамерна вялікае месца ў паэзіі займала тэма дружбы народаў, бо гэта ішло ад самаго жыцця. Таленавітым увасабленнем тэмы партызанскай барацьбы Глебка называў паэму М. Танка “Янук Сяліба”. Хоць аўтары пісалі і пра трагічныя моманты, і пра драматычныя падзеі на вайне, але іх паэзія імкнулася даць надзею суайчыннікам на лепшае і пры гэтым беларускае пісьменства ваеннага часу, канстатуе Глебка, “стаіць на грунце філасофіі глыбокага аптымізму, веры ў жыццё, у бессмяроцце народа” [3, с. 110]. Невялікі артыкул паэта-крытыка “Пімен Панчанка – “Далёкія станцыі” – водгук на выхад у свет зборніка вершаў паэта-



Рэпазіторый ВДУ

франтавіка (1946). Адметнасць гэтай публікацыі заключаецца ў імкненні аўтара да аналітызму. П. Глебка адзначыў мастакоўскую эрудыцыю Панчанкі, што на старонках зборніка згадваў імёны славутых усходніх паэтаў Хаяма і Саадзі, Пушкіна. Крытык спасылаўся і на рэмінісцэнцыю са славутага "Барыса Гадунова" А. Пушкіна ў радках "Не, гэта не апошняя аповесць, і летапіс яшчэ не скончан мой". Глебка звярнуў увагу на ўменне Панчанкі творча засвойваць мастацкі вопыт іншых аўтараў, напрыклад, Уладзіміра Маякоўскага, але пры гэтым заставацца ў літаратуры самім сабой. Кампліментарныя на першы погляд словы пра пісьменніцкае майстэрства Панчанкі насамрэч падмацоўваліся дарэчнымі прыкладамі аналізу літаратурных твораў, а яны давалі падставы сцвярджаць, што "паэтычны свет Панчанкі шырокі і шматколерны. Ён шматгранны не толькі тэматыкай, але і пачуццямі. Панчанка-лірык, але побач з гэтым яго радкі асветлены часта ўсмешкай, а часта насычаны едкай сатырай" [3, с. 112]. Пісьменніцкая індывідуальнасць выяўлялася і ў майстэрстве "выказваць вялікія чалавечыя пачуцці проста і стрымана" [3, с. 111].

Часта да тэмы "вайна і літаратура" звяртаўся Міхась Лынькоў, які на той момант узначальваў пісьменніцкую арганізацыю Беларусі. У артыкуле "Мы пераможам" (1943) старшыня Саюза пісьменнікаў савецкай Беларусі пастараўся падкрэсліць вызначальныя рысы айчыннай літаратуры перыяду вайны: "Што ўяўляе сабой сучасная беларуская літаратура? Гэта літаратура нянавісці і гневу. Гэта літаратура, якая апявае святую помсту і заклікае да помсты, нязгаснай, як сонца, моцнай, як жыццё" [4, с. 184]. Як празаіку М.Лынькову бліжэй было развіццё прозы і драматургіі. Ён адзначаў: "За дні Айчыннай вайны някепска папрацавалі і нашы празаікі, і драматургі. Новыя апавяданні і аповесці напісаны Якубам Коласам, Кузьмой Чорным, Стаховічам, Гурскім, Шынклерам, Садоўскім. Кузьма Чорны працуе таксама над новым раманам аб Айчыннай вайне на Беларусі. Новыя п'есы напісаны нашымі драматургамі Кандратам Крапівой, Вольскім, Маўзонам, Галаўчынерам. Лібрэта новых беларускіх опер напісаны Петрусём Броўкам і Вольскім" [4, с. 194]. Пісьменнік артыкуляваў думку, што вайна не прымусіла замаўчаць творчую інтэлігенцыю. У артыкуле на рускай мове "Беларуская літаратура ў дні Айчыннай вайны" (1943) паўтараліся ідэі папярэдняга артыкула, коратка характарызаваліся паэзія, проза, драматургія, пералічваліся напісаныя ў гэты час творы. М. Лынькоў прыхільна адзываўся аб паэме Якуба Коласа "Суд у лесе". Аўтар артыкула даводзіў, што грамадства зрабіла свой выбар у няпростых умовах вайны, што гітлераўцам не ўдалося паставіць сабе на службу інтэлігенцыю. На рускай мове таксама была напісана "Анатацыя на паэму Аркадзя Куляшова "Сцяг брыгады" (1943). Вартасцямі твора М. Лынькоў лічыў грамадзянскасць, псіхалагізм, праўдзівасць паэмы. Для Лынькова "Сцяг брыгады" – гэта "цудоўны помнік нашых дзён, які ніколі не страціць ні сваёй актуальнасці, ні сваёй паэтычнай прывабнасці" [4, с. 282].

Вынікам асэнсавання шляхоў беларускай літаратуры ваеннага перыяду стала рускамоўнае "Выступленне на пленуме праўлення ССП СССР" (1944). Да "вартых помнікаў непаўторных дзён Вялікай Айчыннай вайны" [4, с. 285] ён аднёс "Беларускім партызанам" Я. Купалы, зборнік "Да родных берагоў" П.Броўкі, "Да зброі" М. Танка, "Адпомсцім!" П.Панчанкі. Творчасць перыяду барацьбы з фашызмам адметная, бо ў пісьменнікаў галоўная "задача адна: сваім мастацкім словам уславіць наш народ, яго бессмяротнасць, яго гераізм у дні Вялікай Айчыннай вайны, паказаць ва ўсёй велічы лепшых яго сыноў – доблесных воінаў Чырвонай Арміі, слаўных партызан, гераічных кіраўнікоў і правадыроў народа "на стагоддзі зняславілі ганьбай гітлераўскіх псоў, вырадкаў фашысцкай Германіі" [4, с. 290]. Нягледзячы на прызнанне дамінантнай выхаваўчай ролі літаратуры, М. Лынькоў заклікаў пісьменнікаў пісаць творы, вартыя эпохі. На рускай мове быў напісаны і артыкул "Беларуская літаратура" (1944), у якім параўноўваліся мінулае і сучаснае айчыннага пісьменства і заўважалася: "Зараз беларуская літаратура жыве гераічнай барацьбой свайго народа з крыважэрнымі фашысцкімі полчышчамі, якія часова паланілі Беларусь" [4, с. 293]. Аналітычны план дамінантны ў працы першага пасляваеннага года "Задачы беларускай літаратуры ў перыяд аднаўлення", якая пачыналася з канкрэтных пытання і адказу: "Што характэрна для нашай паэзіі ваеннага часу? Гэта ў першую чаргу – высокія грамадзянскія пачуцці, сапраўдны патрыятызм, адданае служэнне сваёй радзіме і народу" [4, с. 357–358]. Агульная ацэнка напісанага пра вайну ў ваенны час была высокай: "Я скажу толькі адно, што мы можам ганарыцца нашай паэзіяй – паэзіяй вялікіх філасофскіх абагульненняў" [4, с. 359]; "Усе творы, напісаныя беларускімі паэтамі за гады вайны, гучаць



Репозиторий ВГУ

сапраўдным народным аптымізмам, у аснове якога ляжыць непахісная вера ў справядлівасць нашай справы, у нашы сілы, у перамогу” [4, с. 358]. Лынькоў дастаткова аб’ектыўна вылучаў як лепшае з напісанага празаікамі “апавяданні Кузьмы Чорнага і яго дзве аповесці, праўда, поўнасцю аўтарам не закончаныя і не адрэдагаваныя” [4, с. 361]. Ён не адмаўляў наяўнасці слабых твораў. Так, пра аповесць “Лясы шумяць” А. Стаховіча заўважыў: “Аўтару ўдалося стварыць некаторыя вобразы, якія запамінаюцца. Але асноўныя персанажы аповесці, якія павінны адыгрываць кіруючую ролю, атрымаліся бледнымі, непрыкметнымі: яны не выходзяць за рамкі надуманай схемы, пазбаўленыя той унутранай моцы, духоўнага характва, інтэлекту, якія ў спалучэнні з яркімі індывідуальнымі асаблівасцямі і даюць вобразы сапраўдных кіраўнікоў, арганізатараў, палкаводцаў партызанскга руху. Не раскрыты як след і вобразы ворагаў. Перамогі над імі даюцца ўжо надзвычай лёгка, без асаблівых цяжкасцей, без намаганняў” [4, с. 362].

Меркаванні пісьменнікаў пра створанае ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны дапамагаюць удакладніць псіхалагічную атмасферу таго часу, прасачыць змену аўтарскіх канцэптуальных установак творцаў: ад акцэнтавання выхаваўча-мабілізацыйнай сілы літаратуры, веры ў перамогу да сцвярджэння імператыву праўдзівасці адлюстравання.

Літаратура

1. Мушынскі, М.І. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. 40-я–першая палавіна 60-х гадоў / М.І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка. – 1985. – 343 с.
2. Чорны, К. Збор твораў: у 8 т. Т. 8 / Кузьма Чорны. – Мінск: Маст. літ., 1975. – 616 с.
3. Глебка, П. Збор твораў: у 4 т. Т. 4 / Пятро Глебка. – Мінск: Маст. літ., 1986. – 351 с.
4. Лынькоў, М. Збор твораў: у 8 т. Т. 6 / Міхась Лынькоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 733 с.

Репозиторий ВГУ